# Зацменнік як часціна мовы
## Урок беларускай мовы ў IV класе

**Г. В. Семянюк,**
настаўніца пачатковых класаў
СШ №1 г. Пінска

**Тэма ўрока. Займеннік як часціна мовы.**
**Тып урока:** вывучэнне новага матэрыялу.
**Від урока:** урок-даследаванне.
**Мэта урока:** знаемства вучняў з займеннікам як часцінай мовы.
**Задачы:**
- фарміраваць веды аб займенніку, як часціне мовы, асаблівасці яго ўжывання ў беларускай мове;
- садзейнічаць развіццю мовы, слоўнікавага запасу, лагічнага мыслення, арфаграфічнай пільнасці;
- стварыць умовы для выхавання ў вучняў пачуццё калектывізму і ўзаемадапамогі.

**Абсталяванне**: карткі з заданнямі, кластары, тэст.

### Ход урока

**I. Арганізацыйны момант. Псіхалагічны настрой на працу**

Весела гучыць званок.
Яго голас вам знаёмы.
Запрашаю на ўрок беларускай мовы.

**II. Актуалізацыя ведаў. Праверка дамашняга задання**

Падрыхтуйцеся да праверкі дамашняга задання. Які від работы выконвалі дома?

*(Вусныя адказы на пытанні па тэме "Прыметнік")*

Сёння мы правядзем праверку ў выглядзе тэстаў.

1. Прыметнік – гэта:
а) часціна мовы;
б) член сказа.

2. Прыметнік адказвае на пытанні:
а) хто? Што?;
б) які? Якая? Якое? Якія?;
в) што рабіць? Што зрабіць?

3. Прыметнік звязаны з часцінай мовы:
а) прыметнікам;
б) назоунікам;
в) дзеясловам.

4. Прыметнік абазначае:

а) прадмет;
б) прымету прадмета;
в) дзеянні прадмета.

5. У сказе бывае:
а) галоуным членам;
б) даданым.

6. Прыметнікі змяняюцца па:
а) склонах;
в) ліках і родах.

7. Прыметнікі робяць нашу мову:
а) выразнай;
б) добрай;
в) мілагучнай.

**III. Хвілінка чыстапісання**

Правядзём хвілінку чыстапісання, яна дапаможа нам вызначыць тэму урока

*я , яна, яно, яны, ярэ, яго*

Я, ты, ён, яна – разам дружная сям'я.
Якая літара часцей за ўсё сустракаецца ў сказе?
Ці можа быць літара «я» словам?

**IV. Тлумачэнне новага матэрыялу**

Сення ў нас будзе не звычайны урок, а урок - даследаванне. Прапаную вам стаць даследчыкамі. Вы будзеце працаваць навуковымі супрацоўнікамі, а я буду вашым навуковым кіраўнікам.

Па-першае, трэба вызначыць аб'ект даследавання.

Для гэтага звернемся да чыстапісання.

- Якія часціны мовы вам знаёмы?
- А якой часцінай мовы з'яўляюцца астатнія словы?

Гэтая часціна мовы і стане аб'ектам даследавання.

Займеннік. Ён сустракаецца ў нашай мове часта і па частаце ўжывання займае 3-е месца пасля дзеясловаў і назоўнікаў. Чаму? Загадка. Думаю, што даследаваўшы дадзеную тэму, мы даведаемся адказ.

- Паважаныя супрацоўнікі, пазнаёмцеся, калі ласка, з **планам даследавання**. За час работы на ўроку трэба адказаць на наступныя пытанні:

1. На што ўказвае часціна мовы?
2.Якую часціну мовы замяняе?
3. Якім членам сказа з'яўляецца?
4. Які лік маюць займеннікі?

Вынікі будзем запісваць у кластэр, які стане для вас напамінкам.

1. Каб адказаць на першы пункт плана, давайце выканаем даследаванне, выкарыстоўваючы практ. 55

- Прачытайце, што трэба зрабіць у практыкаванні.
- Чытаем першы сказ, назавіце выдзеленае слова.
- Ці называе яно прадмет?

- А цяпер прачытаем, выкарыстоўваючы слова для даведкі.
- Якое слова ўжываецца замест гэтага прадмета? (Вецер)
- Наступныя сказы запішыце ў сшыткі, выкарыстоўваючы словы для даведкі.
- Правяраем.
- На што ўказваюць займеннікі? А ці называюць яго?
- Робім вынік.

Займеннік указвае на прадмет, але не называе яго. (На кластар)
Паважаныя даследчыкі, вы добра працавалі, прыйшоў час для адпачынку.

**Фізкультхвілінка**

Мы ніколі не сумуем,
Я і ты – усе сябруем.
Павярніся, усміхніся
і да сябра дацягніся.
Управа, улева., паварот,
А затым наадварот.
Нахінайся, не лянуйся,
Я і ты, і ён, яна.
І да сонца падцягніся,
Улева, управа нахіліся.
Раз прысядзьце, два прысядзьце
І за парты ціха сядзьце!
Адпачыць без сумнення
Дапамог нам займеннік.

2. Паважаныя супрацоўнікі, прадаўжаем даследаванне.Чытаем наступны пункт плана.

- Вазьміце картку пад №1

Дзядуля спазніўся на аўтобус. Ён спазніўся на аўтобус. (Абазначыць часціны мовы)

- Прачытайце заданне, выканайце яго і зрабіце вывад.

Займеннік замяняе часціну мовы – назоўнік. (На кластар)

3. Калегі, а вынік наступнага даследавання прапаную зрабіць пасля выканання задання з карткі №2.

Мы любім нашу краіну і хочам, каб яна была магутнай і шчаслівай.
-Вызначце, якімі членамі сказа з'яўляюцца выдзеленыя займеннікі.
Вынік.

Займеннік з'яўляецца дзейнікам, або даданым членам сказа. (На кластар)

4. Якое пытанне мы яшчэ не даследавалі? Прачытаем апошні пункт плана. Каб адказаць на яго, прапаную папрацаваць з правілам падручніка.

- Які можам зрабіць вывад?

Займеннікі змяняюцца па ліках. (На кластар)

- Паважаныя навукоўцы, якую часціну мовы даследавалі?
- Як кіраўнік, лічу даследаванне закончаным і ўсе пытанні раскрытымі.

- Папрашу зрабіць даклад аб выніках даследавання, карыстаючыся кластарам.

**Займеннік указвае на прадмет, але не называе яго.**
**Займеннік замяняе часціну мовы - назоўнік.**
**Займеннік з'яўляецца дзейнікам, або даданым членам сказа.**
**Займеннікі змяняюцца па ліках.**

-У далейшым вывучэнні гэтай часціны мовы мы будзем ім карыстацца,
-А зараз, калегі, праверым атрыманыя веды на практыцы, запішам у сшыткі слоўнікавыя словы.

**V. Замацаванне**
**Слоўнікавыя работа.**
-Бервяно, гараджане, дэлегацыя, унізе, услых, калектыў, аб'язджаць, вуліца, паштальён, секунда.
**-Знайдзіце зашыфраваныя займеннікі і абвядзіце алоўкам. Прачытайце.**

- Прадаўжаем працаваць. Паважаныя даследчыкі, вазьміце картку пад №3
**- Прачытайце тэкст, замест займеннікаў устаўце словы, каб было зразумела аб кім гаворыцца ў тэксце.**

Мама прынесла яго дадому аднойчы вечарам. Гэта стварэнне было яшчэ зусім маленечкае. Змёрзлы і перапалоханы, ён дзіка азіраўся па баках і час ад часу пачынаў гучна плакаць. Толькі апоўначы, выпіўшы цёплага малака, малы заснуў прама на падлозе ля цёплага каміна.

- Пра каго гаворыцца ў тэксце?
- Бачыце, колькі ў вас меркаванняў
- А чаму ў вас не было адназначнага адказу?

У гэтым тэксце не было слова, аб якім ідзе гаворка ў тэксце, а ёсць займеннік, які не называе, а толькі ўказвае на яго.

**Прачытайце жарт, устаўце займеннікі. Вызначце лік і прачытайце.**
- Прывітанне! Чаму … ўчора не быў у школе?
- Старэйшы брат захварэў!
- А … тут пры чым?
- А …катаўся на ягоным веліку!

**Прачытайце па ролях.**

**VI. Рэфлексія**
- Паважаныя навукоўцы, да нас завітаў журналіст і ён жадае задаць вам некалькі пытанняў па тэме даследавання.
- Ці спадабаўся ўрок?
- Якую часціну мовы вы даследавалі?
- На што ўказвае часціна мовы?
- Якую часціну мовы замяняе?
- Якім членам сказа з'яўляецца?
- Які лік маюць займеннікі?

**VII. Дамашняе заданне**
- Пазнаёмцеся з тэкстам дамашняга задання. Пытанні ёсць?
- Паглядзіце на канверт з кластарамі. Каму патрэбен сёння кластар?

– Падыдзіце да дошкі і вазьміце .

**Урок закончаны.**